УДК 316.77:[165.192:172.16]

# ФЕНОМЕН САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ КАМУНІКАЦЫІ Ў СУЧАСНЫМ ГУМАНІТАРНЫМ ДЫСКУРСЕ

***А. І. Смолік,*** *доктар культуралогіі, прафесар, загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле прадстаўлены асноўныя кірункі даследавання асобных аспектаў сацыякультурнай камунікацыі і фарміравання камунікатыўнай кампетэнтнасці спецыяліста сферы культуры. Адзначаецца, што сацыякультурнае ўзаемадзеянне пазітыўна ўплывае на ўстойлівае і стабільнае развіццё дэмакратычнага грамадства. Паказаны статус камунікацыі як праблемнага поля фундаментальнай культуралогіі. Сацыякультурная камунікацыя разглядаецца даследчыкамі як асноўная ідэя сучаснасці і сацыяльнай рэчаіснасці, у сувязі з гэтым падкрэсліваецца, што ў гуманітарным дыскурсе сфарміраваўся шэраг канцэпцый і тэорый, якія ўтрымліваюць погляды на сутнасць, змест і функцыі сацыякультурнай камунікацыі. У артыкуле разгледжаны працы заходнееўрапейскіх, расійскіх і беларускіх навукоўцаў, абагульняецца вопыт сацыяльных інстытутаў Беларусі па фарміраванні камунікатыўнай кампетэнтнасці ў інтэрнэт-карыстальнікаў.

**Ключавыя словы:** гуманітарны дыскурс, кампетэнтнасць, культура, сацыякультурная камунікацыя, рэклама.

# PHENOMENON OF SOCIO-CULTURAL COMMUNICATION IN MODERN HUMANITARIAN DISCOURSE

***A. Smolik,*** *Doctor of Cultural Studies, Professor, Head of the Department of Cultural Studies of the Educational Establishment «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article presents the main directions of research on certain aspects of socio-cultural communication and the formation of communicative competence of a specialist in the field of culture. It is noted that socio-cultural interaction has a positive impact on the sustainable and stable development of a democratic society. The status of communication as a problem field of fundamental cultural studies is indicated. Researchers consider sociocultural communication as the main idea of modernity and social reality. In this regard, the article confirms that a number of concepts and theories have been formed in the humanitarian discourse, which contain views on the essence, content and functions of socio-cultural communication. The article presents the works of both Western European, Russian and Belarusian scientists on this problem. The article summarizes the experience of social institutions of Belarus in the formation of communicative competence among Internet users.

**Keywords:** humanitarian discourse, competence, culture, socio-cultural communication, advertising.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сучасны перыяд развіцця чалавецтва адзначаны інтэнсіфікацыяй камунікацый ва ўсіх галінах сацыяльнага і культурнага жыцця соцыуму. Пры глабалізацыі культурнай прасторы адбываецца не толькі абмен таварамі, паслугамі і капіталам, але паралельна з імі цыркулююць культурна-сімвалічныя коды, каштоўнасці, стандарты, стылявыя формы, г. зн. маркеры культурнай ідэнтычнасці, усё больш транснацыянальныя па сваім змесце. У выніку мабільнасць суб’ектаў нацыянальных культур у тэрытарыяльных, духоўных і псіхалагічных адносінах, па меркаванні Г. М. Маклюэна, павышаецца дзякуючы паслабленню ролі прывычак і традыцый, сацыяльных сувязей і звычаяў, пераадоленню нацыянальнай абмежаванасці [5, с. 46].

Узаемадзеянне суб’ектаў сацыякультурнай камунікацыі садзейнічае вырашэнню задачы падтрымання супольнасцей на ўзроўні максімальнай інфармацыйнай і сэнсавай адкрытасці сусветнай культурнай прасторы. Інфармацыйная адкрытасць і імкненне да ўзаемадзеяння з’яўляюцца адной з важнейшых дэтэрмінантаў устойлівасці і стабільнасці сацыяльных і дзяржаўных інстытутаў дэмакратычнага грамадства. Камунікацыі праз этнасы і іх культуры садзейнічаюць спасціжэнню іншых культур, пераадоленню іх трагічнай несумяшчальнасці.

У сувязі з гэтым у межах культуралагічнага дыскурсу актуалізуецца праблема, звязаная з фарміраваннем камунікатыўнай кампетэнтнасці, ведаў і ўменняў, якія неабходны для эфектыўнага ўзаемадзеяння з суб’ектамі іншай сацыякультурнай прасторы, талерантных адносін адзін да аднаго. У дадзеным кантэксце падаецца, што менавіта культура і культуралагічныя веды павінны ўзяць на сябе складаную задачу пазбаўлення людзей ад застарэлых этнацэнтрычных поглядаў і замены іх на новыя, релятывісцкія, больш адпавядаючыя рэаліям сённяшняга інтэгратыўнага свету. У сувязі з гэтым сацыякультурная камунікацыя разглядаецца ў метадалагічным ракурсе фундаментальнай культуралогіі як асноўная ідэя XXI ст. і сацыяльная рэчаіснасць.

У сучасным гуманітарным дыскурсе сфарміраваўся шэраг канцэпцый і тэорый, мэта якіх – выявіць сутнасць, змест і функцыі камунікацыі. На іх аснове ўзніклі некалькі галін навуковых ведаў: камунікатывістыка, камунікалогія, інфармацыйная культуралогія і інш. У канцы XX – першай чвэрці XXI ст. сутнасць і змест камунікацыі разгледжаны ў працах такіх замежных і беларускіх даследчыкаў, як С. А. Аруцюнаў [1], Н. Вінер [2], Ю. А. Косік [3], С. М. Сарока [7], В. С. Сцёпін [8], Н. Ц. Фральцова [9] і інш.

У беларускіх акадэмічных інстытутах і ўстановах вышэйшай адукацыі ў апошні час інтэнсіфіцыраваліся даследаванні розных сегментаў камунікатыўных практык суб’ектаў беларускай культуры з прадстаўнікамі іншых культур. Так, у Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы ў 2021 г. дацэнтам А. В. Мартынюком завершана фундаментальнае даследаванне «Аўстрыя і Усходняя Еўропа: станаўленне і развіццё палітычных узаемаадносін і культурных кантактаў». Аўтарам сістэмна і комплексна



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даследаваны феномен гістарычных узаемасувязей Аўстрыі і Усходняй Еўропы, вызначаны этапы камунікацый і іх спецыфіка. Даследчык раскрыў ролю Аўстрыі ў трансляцыі каштоўнасцей і сімвалаў беларускай культуры ў краіны Заходняй Еўропы [6].

Спецыфіку камунікацыі інтэрнэт-карыстальнікаў выявіла дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Ю. А. Косік. Навуковец прыйшла да высновы, што глабальнае супольніцтва ўяўляе сабой сусветную сукупнасць карыстальнікаў, чыя анлайн-актыўнасць адбываецца ў адпаведнасці з універсальнымі каштоўнасцямі і нормамі, а камунікацыя ажыццяўляецца з дапамогай асобай сістэмы моў [3, с. 3].

Да феномена сацыякультурнай камунікацыі звяртаюцца антраполагі, культуролагі, сацыёлагі, філосафы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Штогод там ладзяцца навукова-практычныя канферэнцыі, прысвечаныя праблемам метадалогіі ўзаемадзеяння суб'ектаў розных цывілізацый. Так, на факультэце журналістыкі традыцыйнымі сталі навукова-тэарэтычныя канферэнцыі «Карпаратыўныя стратэгічныя камунікацыі: новыя трэнды ў прафесійнай дзейнасці». На іх навукоўцы Беларусі, Расіі і Украіны абмяркоўваюць сацыяльныя вектары і стратэгіі камунікацыі, шляхі ўдасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы камунікацый у сучаснай вышэйшай школе [4]. Менавіта таму на факультэце ў 2007 г. на базе кафедры тэхналогій камунікацыі была створана «Акадэмія камунікацыі», яе мэта – перадаць слухачам прафесійныя веды і навыкі зносін незалежна ад роду дзейнасці.

Камунікатыўная кампетэнтнасць з'яўляецца адной з важнейшых характарыстык у любой сферы жыццядзейнасці. У сувязі з гэтым у шэрагу УВА Рэспублікі Беларусь створаны кафедры сацыяльнай камунікацыі, менеджменту міжкультурнай камунікацыі, рэкламы і грамадскіх сувязей, моладзевай палітыкі і сацыяльных камунікацый і г. д. Выкладанне рэкламнай камунікацыі ў БДУ ажыццяўляецца на аддзяленнях «сацыяльная камунікацыя», «сацыялогія» і «філасофія» факультэта філасофіі і сацыяльных навук. На лекцыях і семінарах студэнты вывучаюць лагічныя, рытарычныя і крытычныя аспекты рэкламнай камунікацыі.

Значны вопыт падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне міжкультурнай камунікацыі назапашаны ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, дзе шмат гадоў функцыянуе кафедра міжкультурных камунікацый і рэкламы. Асноўнымі дысцыплінамі рэкламнага блока з'яўляюцца «Сучасныя тэхналогіі рэкламы і сувязей з грамадскасцю», «Рэкламны менеджмент у сацыякультурных інстытутах», «Рэклама ў сферы культуры» і інш.

Такім чынам, сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны маюць шырокія магчымасці фарміравання камунікатыўнай кампетэнтнасці ў будучых спецыялістаў сацыяльна-гуманітарнай сферы. Адначасова сацыяльныя вектары і стратэгіі камунікацыі, а таксама адукацыйныя практыкі камунікацыі сталі аб'ектам фундаментальных даследаванняў беларускіх навукоўцаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Арутюнов, С. А.* Передача информации как механизм существования этносоциальных и биологических групп человечества / С. А. Арутюнов, Н. Н. Чебоксаров // Расы и народы. – 1972. – Вып. 2. – С. 8–30.

2. *Винер, Н.* Кибернетика, или Управление и связь в живом мире и машине / Н. Винер ; пер. с англ. А. В. Соловьева и Г. Н. Пивоварова. – М. : Наука, 1983. – 344 с.

3. *Косик, Ю. А.* Онлайн-аккультурация личности в глобальном интернет-сообществе : автореф. дис. … канд. культурологиии : 24.00.01 / Ю. А. Косик ; БГУКИ. – Минск, 2018. – 23 с.

4. Корпоративные стратегические коммуникации: новые тренды в профессиональной деятельности : материалы II Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 22–23 февр. 2018 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: И. В. Сидорская (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2018. – 231 с.

5. *Маклюэн, М.* Галактика Гутенберга. Становление человека печатающего / М. Маклюэн. – М. : Академ. Проект, 2005. – 496 с.

6. *Мартынюк, А. В.* Австрия и Европа: становление и развитие политических взаимоотношений и культурных контактов : дис. … д-ра ист. наук : 07.00.03 / А. В. Мартынюк ; БГУ. – Минск, 2021. – 48 с.

7. *Сарока, С. М.* Архітэктоніка інфармацыйнай прасторы беларускай культуры XIX – пачатку XX ст. / С. М. Сарока. – Наваполацк, 2012. – 218 с.

8. *Степин, В. С.* Россия и Запад: взаимодействие культур : материалы круглого стола / В. С. Степин // Вопросы философии. – 1992. – № 6. – С. 4–18.

9. *Фрольцова, Н. Т.* Типология творческой деятельности аудиовизуальной коммуникации / Н. Т. Фрольцова. – Минск : БГУ, 2003. – 210 с.


УДК 316.7:351.853(476-21)

# СОВРЕМЕННЫЕ ТЕНДЕНЦИИ РАЗВИТИЯ КУЛЬТУРЫ КОММЕМОРАЦИИ В ПРОСТРАНСТВЕ БЕЛОРУССКОГО ГОРОДА

***О. М. Соколова,*** *кандидат культурологии, начальник отдела редакционно-издательской и полиграфической работы, доцент кафедры культурологии учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

**Аннотация.** На основе системного подхода выявляются тенденции развития коммеморативной культуры в современном белорусском городе в контексте гуманизации городской среды, концепции креативного города, формирования деятельного патриотизма. Актуальность проблематики обусловлена влиянием культуры памяти на модернизацию городского пространства. Модификация общественных городских пространств посредством создания мест памяти направлена на сохранение и актуализацию историко-культурного наследия, а также на формирование уникального визуального образа города, раскрытие его потенциала как источника развития культуры. Прошлое, закрепляясь в современности, выполняет преобразующую функцию и в этом качестве выступает креативным ресурсом реновации территорий.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ